*Шульчанка Вольга Анатольеўна,*
вядучы навуковы супрацоўнік Музея-бібліятэкі Сімяона Полацкага — філіяла НПГКМЗ

**Музейна-педагагічныя заняткі як сродак папулярызацыі кнігі**

Яшчэ ў 1991 г. супрацоўнікамі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка была распрацавана сістэма музейна-педагагічных заняткаў рознай тэматыкі, якая ўвесь час ўдасканальваецца з улікам сучасных патрабаванняў і падыходаў. На сённяшні дзень распрацаваны доўгатэрміновы музейна-педагагічны праект «Полацк музейны».

Мэта гэтага праекта: выкарыстоўваць адукацыйны патэнцыял адзінаццаці музеяў Нацыянага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка ў развіцці, выхаванні і адукацыі дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту.

У склад праекта «Полацк музейны» ўваходзяць наступныя праграмы:

«Музейны калейдаскоп» (праграма для дзяцей 5-ці гадоў);

«Гісторыя звыклых рэчаў» (праграма для дзяцей 6-ці гадоў);

«Мы прыйшлі ў музей» (праграма для дзяцей 7-мі гадоў);

«Мой старажытны горад» (частка I – праграма для дзяцей 8-мі гадоў);

«Мой старажытны город» (частка II – праграма для дзяцей 9-ці гадоў).

Асобна хочацца пазначыць праграму «Вучымся глядзець і бачыць, слухаць і чуць» для дзяцей 4-гадовага ўзросту. Мэта гэтай праграмы – падрыхтываць дзяцей да ўспрымання музейнага прадмета ў музейнай прасторы.

Увогуле распрацавана каля 50-ці заняткаў, якія праводзяцца ва ўсіх музеях запаведніка па пэўнай сістэме і зацверджаным графіку. Тэматыка іх самая разнастайная. Дзіцячы музей займаецца каардынацыяй і вызначэннем тэматычных накірункаў, а кожны канкрэтны музей распрацоўвае свае профільныя заняткі.

У склад кожнай праграмы ўваходзяць заняткі, якія праводзяць супрацоўнікі Музея беларускага кнігадрукавання. У залежнасці ад тэмы канкрэтных заняткаў супрацоўнікі вылучаюць залу музея для іх правядзення. Большай мастацкай выразнасці спрыяюць сама атмасфера залы, музейныя прадметы у ёй, рэканструкцыі скрыпторыя і друкарні з васковымі фігурамі перапісчыка і друкароў.

Не сакрэт, што цікавасць да кнігі з кожным годам зніжаецца, таму пытанні фарміравання цікавасці ў дзяцей да мастацкай літаратуры патрабуюць пастаяннай увагі. Пачынаючы з дашкольнага ўзросту адбываюцца сустрэчы з кнігай у залах Музея кнігадрукавання. На музейных занятках «Калі ласка, у Кніжны свет» мы знаёмім юных наведвальнікаў з кнігай-цацкай, кнігай-загадкай, кнігай-энцыклапедыяй. Рознымі метадамі і прыёмамі фарміруем у дзяцей эмацыянальны вобраз кнігі. У дзяцей узнікае жаданне дакрануцца да старонак, разгледзець малюнкі, пачытаць кнігу. Таксама на занятках мы паказваем кнігу як крыніцу ведаў, як памочніка, які дае магчымасць перажыць пачуцці герояў, пафантазіраваць.

На занятках даецца кароткая характарыстыка музея; тлумачыцца, што кніга – галоўны музейны прадмет Музея беларускага кнігадрукавання, праводзіцца кароткі экскурс у гісторыю кнігі, разглядаюцца такія паняцці, як «рукапісныя кнігі», «друкаваныя кнігі», «навуковая бібліятэка»; адбываецца знаёмства з цікавымі выданнямі з фондаў музея (дзіцячыя кнігі розных гадоў выдання, кнігі-цацкі).

На занятках «Нараджэнне кнігі» (для дзяцей 6-ці гадоў) супрацоўнікі музея знаёмяць вучняў з гісторыяй станаўлення кніжнай культуры, паказваюць, што кніга – найвялікшае вынаходніцтва чалавецтва, якому няма роўных; расказваюць пра матэрыялы, якія выкарыстоўваліся для пісьма ў старажытнасці, паказваюць, чым пісалі ў даўнія часы, у тым ліку і на ўсходнеславянскіх землях; знаёмяць з формамі кніг, якія існавалі ў розных народаў і тым самым фарміруюць цікавасць да гістарычнага мінулага, да музея як

захавальніка пісьмовай гістарычнай спадчыны; вучаць паважліва адносіцца да кнігі – як да музейнага прадмета і як да вялікай каштоўнасці.

У 7 гадоў нашы наведвальнікі ўжо ўспрымаюць кнігу як галоўную крыніцу ведаў, добра ведаюць розніцу паміж кнігай мастацкай і кнігай-падручнікам. А дапамагаюць ім супрацоўнікі музея на занятках па тэме «Як вучыліся дзеці раней» (праграма «Мой старажытны горад. Ч. 1»). Вучні могуць не толькі пазнаёміцца з гісторыяй школьнай адукацыі на Беларусі, прасачыць традыцыі школьнай сістэмы, даведацца пра ўмовы навучання ў старажытных школах, але і рашаць матэматычныя прыклады, карыстаючыся не лічбамі, а літарамі кірыліцы, даведацца, адкуль пайшлі словы «аднакашнікі» і «дысцыпліна» і высветліць, з якой мэтай у клас прыносіліся розгі.

Асобае пачуццё патрыятызму і гонару за свой горад, яго мінулае фарміруюць супрацоўнікі музея на занятках з дзецьмі чацвёртых класаў у курсе праграмы «Мой старажытны горад. Ч. 2». Па гэтай праграме праводзяцца наступныя заняткі:

«Рукапісная кніга. Еўфрасіння Полацкая»;

«Жыццё і дзейнасць Францыска Скарыны».

На гэтым этапе супрацоўнікі музея ставяць для сябе наступныя мэты :

1) пазнаёміць слухачоў з жыццёвым шляхам і дзейнасцю асветнікаў;

2) паказаць выключную ролю і значэнне дзейнасці гэтых людзей для беларускай і сусветнай гісторыі;

3) развіваць і выхоўваць пачуццё патрыятызму, любоў да роднага краю;

4) садзейнічаць развіццю самасвядомасці, пачуцця гонару за свой горад і яго славутых землякоў.

Разам з музейнымі супрацоўнікамі вучні пішуць на васковых таблічках і пяром у скрыпторыі, спрабуюць сябе ў ролі мастакоў-гравёраў. Заняткі для ўсіх узроставых груп праводзяцца на беларускай мове. Супрацоўнікі музея прымаюць удзел у семінарах для выхавацеляў дашкольных устаноў і настаўнікаў школ.

У снежні гэтага года ўпершыню былі праведзены пробныя заняткі для дзяцей 1,5 -2-х і 3-4-х гадоў. Юныя наведвальнікі з цікавасцю разглядалі кнігі цацкі, разам з мамамі рабілі сваю кнігу, размалёўвалі яе.

Такое цеснае супрацоўніцтва сям'і, дашкольнай установы, школы і музея дае магчымасць ствараць новыя сумесныя праграмы, фарміраваць гарманічна развітую асобу.